## ДАДАНЫЯ СКАЗЫ СА ЗЛУЧНІКАМ *CUM*

### Даданыя сказы часу

1. **Даданыя сказы часу са злучнікам cum (temporāle)** — ***калі***. Указваюць на звычайныя суадносіны ў часе паміж дзеяннямі ў галоўным і даданым сказах. Ужываюцца ўсе формы indicatīvus: Cum pater domum vēnit (*perf. ind.*), filius librum legēbat (*imperf. ind.*). — *Калі бацька прыйшоў дадому, сын чытаў кнігу.*

2. **Даданыя сказы часу са злучнікам cum (historĭcum)** — ***калі***, ***пасля таго як***. Ужываюцца пры апавяданні пра мінулыя падзеі, прычым дзеянне даданага сказа абумоўлівае дзеянне галоўнага сказа. У даданым сказе ўжываецца: а) imperfectum conjunctīvi для ўказання на адначасовае дзеянне; б) plusquamperfectum conjunctīvi для ўказання на папярэдняе дзеянне: Cum pater domum venisset (*pqperf. conj.*), librum legēbat (*imperf. ind.*). — *Пасля таго як бацька прыйшоў дадому, ён чытаў кнігу.*

### Даданыя сказы прычыны

Далучаюцца злучнікам cum (causāle) — *так як*, *таму што*, *бо*. У даданым сказе ўжываюцца часы па наступным правіле:

| Час у даданым сказе | Дзеянне даданага сказа адносна дзеяння галоўнага сказа | |
|---|---|---|
| | адначасовае | папярэдняе |
| Галоўны | *praes. conj.* | *perf. conj.* |
| Гістарычны | *imperf. conj.* | *pqperf. conj.* |

Напрыклад: Cum pater domum non venisset (*pqperf. conj.*), librum non legēbat (*imperf. ind.*). — *Так як бацька не прыйшоў дадому, ён не чытаў кнігу.*

### Даданыя сказы ўступкі

Далучаюцца злучніка cum (concessīvum) — *хоць*, *нягледзячы на тое што*. У даданым сказе ўжываюцца часы па наступным правіле:

| Час у даданым сказе | Дзеянне даданага сказа адносна дзеяння галоўнага сказа | |
|---|---|---|
| | адначасовае | папярэдняе |
| Галоўны | *praes. conj.* | *perf. conj.* |
| Гістарычны | *imperf. conj.* | *pqperf. conj.* |

Напрыклад: Cum pater domum venisset (*pqperf. conj.*), librum non legēbat (*imperf. ind.*). — *Хоць бацька прыйшоў дадому, ён не чытаў кнігу.*